# 5-га снежня — свята савецкай дэмакратыі

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

**Беларускі ўніверсітэт**

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА і ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя У. І. ЛЕНІНА

Год выдання 18-ы

№ 38 (586)

Чацвер, 3 снежня 1964 г.

Цана 1 кап.

# У студэнтаў саюзных рэспублік

*(Па старонках шматтыражных газет)*

Тры адэскіх журналісты прысвяцілі песню «Белы ветразь» двум беларускім дзяўчатам Людзе і Веры Злотнікавым, якія перамаглі шмат перашкод на шляху да сваёй запаветнай мары — стаць штурманамі. Цяпер сёстры — на апошнім курсе Адэскай мараходкі. Словы напісалі Б. Кердман і Ю. Міхайлік, музыку—Н. Амельчанка.

**З газеты «Кадри будовам» (Адэскі інжынерна-будаўнічы інстытут).**

* * *

Казанскаму ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнаму універсітэту імя У. І. Ульянава-Леніна—160 гадоў. У Вялікім тэатры оперы і балету імя Мусы Джаліля (Казань) адбылося ўрачыстае пасяджэнне, прысвечанае гэтай знамянальнай даце.

**З газеты «Ленинец» (Казанскі універсітэт).**

* * *

Фундаментальная бібліятэка Самаркандскага дзяржаўнага універсітэта імя Алішэра Наваі, заснаваная ў 1927 годзе,—адна з буйнейшых бібліятэк у вышэйшых навучальных установах Сярэдняй Азіі. Яна налічвае ў сваім фондзе звыш мільёна экземпляраў кніжнай і журнальнай літаратуры. Выключна каштоўнымі з'яўляюцца літаграфаваныя выданні на усходніх мовах. З 1960 года штомесячна бібліятэка выпускае «Бюлетэнь новых паступленняў па галінах навукі».

**З газеты «Самарканд университети».**

* * *

Студэнты Таджыкскага дзяржаўнага універсітэта працавалі у калгасах рэспублікі на ўборцы ўраджаю хлопка. Першае месца ў спаборніцтве заваяваў хімічны факультэт, якому ўручаны пераходны Чырвоны сцяг універсітэта.

**З газеты «К вершинам знаний» (Таджыкскі універсітэт).**

* * *

На пасяджэнні Вучонага савета біёлага-глебавага факультэта дацэнт А. І. Лакамкін паспяхова абараніў доктарскую дысертацыю на тэму «Аб нярвовых механізмах рэгуляцыі пітной і харчовай узбудлівасці».

**З газеты «Воронежский университет».**

# „Мы жывём добра!..“

*РЭПАРТАЖ*

Першым быў урок рускай мовы. Так павялося ўжо: самае цяжкае рабіць раніцай. Выкладчыкі занялі свае месцы, і на іх скіраваліся позіркі цікаўных, чакаючых, насцярожаных вачэй. Здавалася, што гэта глядзіць сённяшняя Афрыка, гучыць яе паўнапраўны многанацыянальны голас. У многіх аўдыторыях падрыхтоўчага факультэта— прадстаўнікі розных куткоў Афрыкі: Кеніі, Ганы, Занзібара, Нігера, Руанды, Самалі, Конга.

Вось ля дошкі юнак з Ганы Асарэ Данкор Стэфен. Добры гэта хлопец. Свой працоўны дзень ён плануе такім чынам, каб быць у пастаянным кантакце са сваімі землякамі, якія абралі яго главой зямляцтва ганскіх студэнтаў у БДУ.

У суседняй аўдыторыі сабраліся другія афрыканскія студэнты. Яны пішуць сачыненне. Аб запаветнай мары. Над сшыткам схіліўся Ібрагім Маман, юнак з Нігера. Ён быў салдатам арміі алжырскіх патрыётаў. Дух барацьбіта жыве ў ім і сёння. Чаго ж хоча ад жыцця гэты юнак? Стаць спецыялістам, вызваліць сваю радзіму ад каланіялізму і неакаланіялізму.

Званок. Выкладчыкі Зоя Яфімаўна Какошнікава, Васіль Ульянавіч Протчанка, Рагіна Васільеўна Ульянка і іншыя развітваюцца са сваімі выхаванцамі. Але ненадоўга. Увечары яны зноў сустрэнуцца з імі ў гадзіны самападрыхтоўкі.

А пакуль што іх месца займаюць выкладчыкі фізікі, хіміі, матэматыкі. На дошцы ў адной з аўдыторый вырастаюць лічбы, матэматычныя знакі. Гэта выкладчык Уладзімір Нікіціч Стрэльчанка дае кантрольнае заданне студэнту з Кеніі Закарыю Авала. Задача нялёгкая, але студэнт рашае хутка, правільна. І яго сябар Джошуа Аціена ніколькі не хвалюецца. Джошуа упэўнены, што Закарыю справіцца з задачай. Сябры пачалі тут вывучаць курс матэматыкі з самых «азоў». І вось вынік. Афрыканскія юнакі паспяхова авалодваюць вучэбнай праграмай.

А на лекцыі па хіміі — цішыня. Сёння тут першае слова за выкладчыкам, ён растлумачвае новае. У гэтай групе ёсць пасланец Руанды Каліса Аўгусцін. Каліса любіць гаварыць пра сваю Радзіму, пра самаадданую барацьбу афрыканскіх народаў супраць імперыялізму. На адным са студэнцкіх вечароў Каліса выступіў з дакладам і расказаў пра барацьбу кангалезскіх патрыётаў.

Вучэбны час закончыўся. Заняткі былі цікавымі, змястоўнымі. Вунь тоненькая Муанапілі Махмоуд Мзсе з Занзібара. Яна спяшаецца, але ўсё яшчэ працягвае вучыць на памяць рускія сказы. А самаліец Ясін Махмуд Мірэ аб нечым спрачаецца з сябрам, здаецца, аб нейкай фізічнай формуле.

Пасля заняткаў студэнты адпачываюць. Каб сіл набрацца перад самастойнай падрыхтоўкай да заўтрашняга дня. Яна будзе праходзіць у вучэбных аўдыторыях, бібліятэцы, кабінетах. Упушчанае будзе нагнана з дапамогай харошага сябра, беларускага студэнта.

Разам са сваімі беларускімі сябрамі афрыканскія студэнты ходзяць у кіно, глядзяць спектаклі, бываюць на прадпрыемствах, сустракаюцца ля піянерскага кастра з савецкімі школьнікамі, выступаюць з канцэртамі мастацкай самадзейнасці.

Іх усё цікавіць. І таму, напрыклад, кенійскія студэнты наладжваюць цяпер работу свайго гуртка па вывучэнню асноў марксісцка-ленінскай тэорыі.

Так жывуць афрыканскія студэнты на беларускай зямлі. І нездарма яны шлюць дамоў лісты, а ў іх пішуць: «Дарагія мама і тата, я жыву добра!..»

**Я. БАРАНОЎСКІ,**
**студэнт 4-га курса гістфака.**

# Чалавек заўсёды мае права

## НА ВУЧОБУ,



## ПРАЦУ,



## АДПАЧЫНАК!



Малюнкі студэнта Б. ЖУКАВА

# „Пяць гадоў кубінскай рэвалюцыі“



Некалькі дзён у галоўным корпусе універсітэта функцыяніравала выстаўка «Пяць гадоў кубінскай рэвалюцыі», арганізаваная кубінскімі студэнтамі, што навучаюцца ў Мінску. Выстаўка расказала пра вялікія поспехі гераічнага вострава Свабоды за гады рэвалюцыі. Цяпер выстаўка накіравалася ў падарожжа па іншых гарадах рэспублікі і краіны.

На здымку: студэнты універсітэта Карлас Арсі, Віктар Трацякоў, Хасэ Фахарда ля макета прадпрыемства па перапрацоўцы цукровага трыснягу.

Фота В. Адзіяна

# СПЫНІЦЬ АГРЭСІЮ!

Афрыканскія студэнты, што навучаюцца ў СССР, і, у прыватнасці, студэнты, якія навучаюцца ў Мінску, рашуча асуджаюць дзеянні амерыканскіх і бельгійскіх каланізатараў у Конга. Яны ўзнімаюць свой голас пратэсту супраць пасылкі ў Конга амерыканскіх і бельгійскіх салдат. Афрыканскія студэнты звяртаюцца да ўсіх міралюбных народаў свету з просьбай прыняць самыя рашучыя меры, якія прымусілі б імперыялістаў спыніць агонь у Конга.

Кангалезскі народ сам і толькі сам мае права вырашаць свае ўнутраныя справы. Адкрыты разбой у Конга супярэчыць заявам Вашынгтона аб тым, што ЗША стаяць за мірнае суіснаванне. Усяму свету вядомы злачынныя дзеянні імперыялістаў. Афрыканскі народ не можа больш мірыцца з такім становішчам у Конга.

Імперыялісты баяцца страціць сваё фінансавае панаванне ў Конга. Таму яны пастаўляюць сваёй марыянетцы Чомбе сучасную зброю і салдат, каб падавіць рух паўстанцаў, якія змагаюцца супраць марыянетачнага ўрада.

Я лічу, што ААН павінна прыняць меры для ўрэгулявання становішча ў Конга. Амерыканскія імперыялісты павінны спыніць агрэсію ў Конга і ў Паўднёвым В'етнаме, бо яна стварае пагрозу міру і бяспецы народаў.

Прыйшоў час спыніць агрэсіўныя дзеянні імперыялістаў. Яны павінны адказаць за падзеі ў Конга!

**Чарльз ОКАТ,**
**кеніец,**
**студэнт 1-га курса матфака.**

